Віленскі беларускі музэй імя Івана Луцкевіча: бюлетэнь

чэрвень
2026

ПАДЗЕІ АРХІЎ

Вышыванае Падляшша

Цягам чэрвеня працавала выстава мастачкі Мальгажаты Дмітрук (Варшава) пра складанае жыццьцё беларуска-польскага памежжа. На закрыцьці выставы засьпявала Ілона Карпюк пад акампанімэнт Паўла Аракеляна. Выставу дапамаглі зрабіць нашыя сябры - Цэнтар беларускай культуры ў Беластоку.

Першая нашая канфэрэнцыя

“Культура ў палоне мінулага” прайшла 11-13 чэрвеня, дзе сабраліся амаль 50 навукоўцаў і актывістаў спадчыны зь Літвы, Польшчы, Нідэрляндаў, Італіі, Нямеччыны, Чэхіі. Цяпер працуем над публікацыяй артыкулаў па прадстаўленых дакладах. Канфэрэнцыю падтрымалі Scholars for Belarus. Тэзісы тут.

Два тыдні дзіцячага летніку

Дзякуючы падтрымцы прыватнага нямецкага фонду Nähring Stiftung, мы змаглі зладзіць двухтыднёвы дзённы летнік, зрабіць яго вельмі танным, а для дзяцей былых палітвязьняў - бясплатным.

Прэзэнтацыя кнігі пра Гародню

Віленскім чытачам гісторык Фелікс Акерман прэзэнтаваў кнігу “Гісторыя Гародні 1919-1991”, у суправаджэньні кіпучых дыскусіяў і жвавага інтарэсу.

ГОСЬЦІ

Госьці з Нацыянальнага музэю

Музэй наведала дэлегацыя з этнаграфічнага аддзелу Літоўскага нацыянальнага музэю. Госьці азнаёміліся з прыкладамі нашых збораў і склалі дамоўленасьці аб адпавядным візыце.

Кафлю агледзела кафлязнаўца

Нашай калекцыяй керамікі зацікавілася мастацтва-знаўца, доктарка Даля Клаюмене. Агледзіўшы экспанаты, яна пакінула нам сваю манаграфію аб кафлі, што вельмі нам дапаможа з апісаньнем экспанатаў.

Ляймэнскія справы

Пачаўся разбор калекцыі Юр'я Попкі з Ляймэну пасьля трохмесечнай перамарозкі экспанатаў. Справа выконваецца дзякуючы фундатарам, якія ахвяравалі 200 эўраў на стылажы, дзе месьціцца збор. У верасьні плянуецца выстава, якая пазнаёміць з матэрыяламі збору. Адначасова музэй вядзе ліставаньне з архівамі Ляймэну з мэтай знайсьці інвэнтарную кнігу калекцыі.

Набыты выдатны стэляж

За некалькі дзён пасьпяхова закрыты збор грошай на стэляж, і яшчэ за два дні стэляж змантаваны і запаўняецца рэчамі былых палітвязьняў і экспанатамі зь ляймэнскай калекцыі Юрыя Попкі.

Разбор калекцыі прэсы

За чэрвень апрацаваная частка калекцыі бел. прэсы: збор Нашай Нівы Сяргея Дубаўца, збор самвыдату Сяржука Вітушкі, збор віленскай беларускай прэсы Аляксея Анішчыка. Асобныя экспанаты паразьнятыя і выкладзеныя на archive.org.

Вусная гісторыя Нашай Нівы

Пачаты збор інтэрв'ю для выставы на ўгодкі газэты Наша Ніва. Запісаныя размовы з Сяргеем Дубаўцом, Сяргеем Харэўскім, Андрэем Антонавым. Хто хоча падзяліцца сваімі ўспамінамі аб Нашай Ніве 1992-1997, вуснымі ці пісьменнымі, просім пісаць у музэй з тэмай ліста “НН” на пошту hello@vilnia.com.

Вусная гісторыя радыё

Прадоўжыўся запіс інтэрв’ю аб гісторыі бел. радзіва. Аб працы на “Бальтыцкіх хвалях” распавялі Андрэй Антонаў, Тацьцяна Поклад, Сяргей Дубавец, разабраны невялічкі, але ж інфарматыўны збор радзіва ў архіве. Дзяліцеся ўспамінамі й дакумантамі пра бел. радзіва на тую ж пошту з тэмай “Радзіва”.

АХВЯРАВАНЬНІ

Ахвяра ў 200 тэчак ды 210 эўраў

Падчас разбору архіву нам патрэбныя сотні а сотні тэчак. Нашая сяброўка Тацьцяна ахвяравала 200 тэчак, якія адразу пайшлі ў карыстаньне для разбору архіву “Талакі”. Грашовыя ахвяраваньні за чэрвень склалі 210€ (плюс 200 на стэляж). Самы шчодры ахвярадаўца - маленькі Даніель, які зьбіраў ўвесь год і аддаў на школку 70€.